*Козел, С.А.* Месца багемскага караля ў сістэме імперскага права паводле Залатой булы 1356 г. / С.А. Козел // Лістападаўскія сустрэчы – 5. Праблемы старажытнасці і сярэднявечча: Зборнік артыкулаў па матэрыялах Міжнароднай навуковай канферэнцыі ў гонар акадэмікаў М. М. Нікольскага і У. М. Перцава (13–14 лістапада 2003 г., Мінск) / Навук. рэд. В. А. Фядосік і І. А. Еўтухоў. — Мн.: БДУ, 2005. — С. 186–188.

***С. А. Козел***

# МЕСЦА БАГЕМСКАГА КАРАЛЯ Ў СІСТЭМЕ ІМПЕРСКАГА ПРАВА ПАВОДЛЕ ЗАЛАТОЙ БУЛЫ 1356 Г.

Залатая була, адна з самых вядомых крыніц сярэдневяковага нямецкага права, была прынята на агульнаімперскіх соймах у Нюрнбергу і Мецы ў 1356 г. Лічыцца, што гэта было зроблена па ініцыятыве Карла IV, але ў інтарэсах курфюрстаў, паўнамоцтвы якіх у сярэдзіне XIV ст. выраслі і канчаткова былі замацаваны ў дадзеным дакуменце. З 31 раздзела 21 прысвечаны курфюрстам, іх прывілеям, удзелу ў кіраванні імперыяй і прыдворным жыцці. Асабліва цікава прааналізаваць, якія правы атрымаў кароль Багеміі, чаму ён стаў першым сярод свецкіх курфюрстаў, а Чэхія заняла асобнае месца ў сістэме ленных сувязей імперыі.

Безумоўны ўплыў на такое становішча спраў аказаў імператар Карл IV, што адначасова быў і чэшскім каралём, і таму клапаціўся пра ўладкаванасць дамена і сваіх правоў у якасці курфюрста, тым болып, што яны не былі бясспрэчнымі ў дачыненні багемскага караля. У складзе калегіі з 7 курфюрстаў, якія выдзеліліся да канца XII ст., толькі становішча чэшскага караля было хісткім — права яго голаса аспрэчвалася баварскімі герцагамі. Так, калі ў 1257 г. у выбарах удзел прымаў Пржэмысл Атакар, то ў выбранні Рудольфа Габсбурга ўдзельнічаў ужо Генрых Баварскі, праз два дзесяцігоддзі кароль Чэхіі вярнуў сабе гэтае права, тым не менш крыніцы таго часу сведчаць, што ў багемскага караля быў моцны канкурэнт. «Саксонскае зярцала» адмаўляла каралю ў праве быць удзельнікам калегіі, бо ён «не з’яўляўся немцам» (III, 57, 2). Адзін з варыянтаў «Швабскага зярцала» сведчыць, што месца віначарпія было аддадзена герцагу Баварскаму. Аднак у 1298 г. імператар Альбрэхт надаў Вацлаву II прывілей, які быў пацверджаны Карлам IV у 1348 г. і цалкам увайшоў у Залатую булу. Карл IV замацаваў першае месца сярод свецкіх курфюрстаў за чэшскім каралём (IV, 2). Першынство караля падкрэсліваецца тым, што ў час імперскага ўрачыстага сходу, пры любым пасяджэнні кароль Чэхіі павінен займаць ганаровае першае месца справа ад імператара, падчас выбараў імператара кароль першым са свецкіх курфюрстаў падаваў свой голас за кандыдата. У рэшце рэшт, на імперскіх сходах, выконваючы абавязкі віначарпія, якія Була канчаткова замацавала за багемскім каралём, ён не быў абавязаны падаваць



кубак імператару, калі будзе мець каралеўскую карону на галаве, хіба толькі яму захочацца зрабіць гэта з уласных памкненняў (IV, 3). Заўважым, што астатнія курфюрсты не мелі такога права, выконваючы свае службы, але яны і не былі каралеўскага сана, які даваў каралю Багеміі права быць вышэй іншых свецкіх курфюрстаў, а таксама ўсіх астатніх без выключэння каранаваных асоб, прысутных на ўрачыстых імперскіх сходах (VI).

Чэшскае каралеўства паводле некалькіх раздзелаў заняло асобнае месца ў імперыі. Найперш гэта тычыцца судовай сістэмы. Карл IV замацаваў за багемскім каралём права на прымяненне паўнаты сваёй улады ў гэтай галіне, дзякуючы ўвядзенню правілаў de non evocando і de non appellando, г. зн. любы жыхар каралеўства не мог быць выкліканы ў суд за межы каралеўства, акрамя як у суд караля Багеміі і суддзяў яго каралеўскай курыі, а таксама апеляваць да якога б ні было іншага суда, у зваротным выпадку апеляцыі не будуць прэтэндаваць на законнасць (VIII). Аўтаматычна гэтае правіла было распаўсюджана і на іншых курфюрстаў, але эфектыўна яно дзейнічала толькі ў межах Багеміі, у той час як першае афіцыйнае ўпамінанне ў крыніцах пра карыстанне гэтым палажэннем іншым курфюрстам — у прыватнасці архіепіскапам Трырскім — адносіцца да 1716 г., калі ён дабіўся недапушчэння апеляцыі сваіх падданых да імперскага суда. Няма сумнення, што першапачаткова фіксацыя гэтага права рыхтавалася Карлам для свайго дамена. Тое ж можна сцвярджаць і пра прадастаўленне каралю Багеміі горнай, мытнай і манетнай рэгалій, якія фіксавалі рэальнае становішча спраў ў Чэхіі і затым былі распаўсюджаны на астатніх курфюрстаў. Як прыклад — пачатак раздзела X «Пра манеты», дзе размова вядзецца толькі пра Багемію і толькі ў канцы з’яўляецца прыпіска «мы жадаем, каб гэтая пастанова ... поўнасцю была распаўсюджана на ўсіх князёў-выбаршчыкаў». Акрамя гэтага, змест крыніцы, што з'явілася крыху раней, чым Залатая була, а менавіта сведчанне і пацвярджэнне архіепіскапа Герлаха Майнцкага правоў багемскага караля, прызнаных імператарам і курфюрстамі (7.01.1356), у цэлым супадае з прывілеямі Багеміі ў раздзелах VIII, IX, X булы, што дазваляе сцвярджаць аб папярэдняй распрацоўцы Карлам IV дадзеных палажэнняў, якія першапачаткова тычыліся толькі ўласнага дамена Люксембурга.

Выгаднае становішча Багеміі ў сістэме ленных сувязей імперыі было замацавана Карлам і ў дачыненні да выбараў караля ў выпадку спынення дынастыі. Калі іншае курфюрства ў такой сітуацыі павінна было вярнуцца ў якасці імперскага лена ў распараджэнне манарха, то ў Чэхіі саслоўі мелі права еамастойна выбіраць сабе



караля (VII), што не толькі падкрэслівала выключнае становішча каралеўства, але і афіцыйна замацоўвала яго ў Залатой буле 1356 г. Чэхія станавілася незалежнай ад імперыі. Змагла б дынастыя Люксембургаў, да якой належаў Карл, замацавацца на імперскім троне або не — у любым выпадку була гарантавала яе прадстаўнікам выгаднае і ўплывовае становішча ў палітычнай арганізацыі імперыі, гэта яшчэ адзін прыклад паспяховай уласнай дыпламатыі Карла IV.

Такім чынам, разгляд становішча багемскага караля як прадстаўніка курфюрцкай калегіі і яго ўласнага каралеўства як складовай часткі Свяшчэннай Рымскай імперыі дазваляе зрабіць наступныя вывады:

1) асноўнай дзеючай асобай у замацаванні прывілеяванага становішча каралеўства і правоў багемскага караля стаў Карл IV, што яскрава адлюстравалася ў канстытуцыі імперыі — Залатой буле 1356 г., складзенай пры яго непасрэдным удзеле;
2) паводле булы чэшскі кароль атрымоўваў першынство ў калегіі сярод свецкіх курфюрстаў;
3) у буле былі заканадаўча зафіксаваны значныя паўнамоцтвы караля ў судовай справе, а таксама горная, манетная і мытная рэгаліі, што было ўзорам для аналагічнага дзеяння ў адносінах да іншых курфюрцкіх уладанняў, зробленага ў тэксце дакумента пад ціскам астатніх курфюрстаў;

4) чэшскія саслоўі атрымалі выключнае права выбіраць сабе караля ў выпадку спынення дынастыі ў адрозненне ад астатніх курфюрстваў, якія не маглі прэтэндаваць на дасягненне такога становішча нават намінальна.